**Класная гадзіна «Гарады Беларусі»**
**Краязнаўства – напрамак працы класнага кіраўніка ў агульнаадукацыйнай школе.**

**І. І Захарэвіч,**
настаўнік Трабскай СШ Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці

З дзяцінства і да глыбокай старасці кожны чалавек злучаны са сваёй радзімай. Дзе бы мы ні жылі, на якой бы мове ні размаўлялі, Беларусь – наша адзіная Радзіма. Аднак у кожнага чалавека ёсць яшчэ і свой, самы любімы і дарагі для яго сэрца куток зямлі, дзе ён першы раз усміхнуўся, упершыню ўбачыў святло сонца і цемру ночы, зрабіў першыя крокі, першае слова і першы сказ. Гэта месца – горад, мястэчка, ці вёска – непараўнальнае ні з чым іншым. Гэта яго пачатак жыцця, Малая Радзіма.

У нашай дзяржаве значная ўвага заўсёды надавалася і надаецца навучанню і выхаванню моладзі. Важнае месца ў навучанні і выхаванні вучняў у агульнаадукацыйнай школе адводзіцца класнаму кіраўніку. Існуе шмат кірункаў яго працы, адным з іх з’яўляецца краязнаўства.

Знаёмства вучняў агульнаадукацыйнай школы з краязнаўчым матэрыялам дае магчымасць падтрымліваць у іх цікавасць да новых ведаў. Асноўным момантам такога знаёмства становіцца дзейнасць саміх школьнікаў, калі яны вучацца назіраць і самастойна назіраюць, вучацца параўноўваць і самастойна параўноўваюць, робячы вызначаныя высновы.

Адрозніваюць наступныя кірункі краязнаўчай працы:




**Геаграфічнае краязнаўства** вывучае кліматычныя асаблівасці мясцовасці: лясныя і стэпавыя масівы, узгоркі, яры, паркі і асобныя дрэвы, курганы, фрагменты ландшафту і марскіх акваторый, стэпавыя курганы, асобныя горы і даліны, глебы, раслінны і жывёльны свет, рэкі, азёры і крыніцы.

Аб’ектам **мастацкага краязнаўчага пошуку** могуць стаць культура, архітэктура, мастацкія рамёствы, вусная народная творчасць, музычны фальклор, разьба па дрэве, мастацтва танца.

Прадметам пільнай увагі **краязнаўцаў-гісторыкаў** з’яўляецца гісторыя ўзнікнення і развіцця малых і вялікіх гарадоў, мястэчкаў, вёсак, асобных будынкаў і вуліц, звесткі пра жыццё і дзейнасць вядомых асоб краіны і сваёй і малой радзімы, гісторыя ўзнікнення і развіцця прадпрыемстваў розных форм уласнасці, навучальных, медыцынскіх і ўстаноў культуры, сацыяльных працэсаў і з'яў на тэрыторыі Беларусі і сваёй малой радзімы.

Мэтай **літаратурнага краязнаўства** з’яўляецца выяўленне дзвюх залежнасцяў: як той ці іншы горад (вёска) сфарміравалі асобу пісьменніка (паэта) і як гэты пісьменнік (паэт) паказаў у сваёй творчасці тую ці іншую мясцовасць.

**Асноўнымі крыніцамі краязнаўчай інфармацыі з’яўляюцца:**

- перыядычны друк (газеты, часопісы);
- мастацкая літаратура (важна памятаць, што не кожны пісьменнік
- (паэт) заўсёды праўдзіва адлюстроўвае ў сваёй творчасці рэчаіснасць);
- архіўныя фонды;
- фонды музеяў;
- розныя планы і карты;
- матэрыяльныя сляды культуры (архітэктура і скульптура);
- матэрыялы статыстыкі;
- расказы сведкаў пэўных падзей на тэрыторыі Беларусі і сваёй малой радзімы.

**Асноўныя прынцыпы краязнаўчай працы:**

- ✓ сістэмны падыход;
- ✓ лімітаваная пэўная колькасць фактаў;
- ✓ сінхроннасць кірункаў пошуку.

**Формы краязнаўчай працы** – урочная і пазакласная – як актыўная (сам пошук, турызм, палявая праца) і пасіўная (адпрацоўка палявых матэрыялаў, экскурсійнае абслугоўванне ў краязнаўчых музеях). Пазакласная краязнаўчая праца – гэта пошукавыя экспедыцыі, турызм, краязнаўчыя гурткі, тэматычныя вечары, конкурсы, алімпіяды. Канчатковым вынікам краязнаўчай працы з’яўляецца стварэнне школьнага музея. Тэматыка і формы працы з вучнямі, глыбіня пастаноўкі асобных задач залежаць ад узросту і індывідуальных асаблівасцяў школьнікаў.

**Задачы краязнаўчай працы з вучнямі:**

- ✓ правесці працу па стварэнні ўмоў для навучання і выхавння школьнікаў;
- ✓ развіваць у вучняў цікавасць да вывучэння культурна-гістарычных каштоўнасцей нашай краіны і сваёй малой радзімы;
- ✓ прыцягваць школьнікаў да працы па адраджэнні і захаванні культурных і духоўна-маральных каштоўнасцей роднага краю;
- ✓ вывучаць гісторыю свайго краю, народа, краіны для далейшага ўмацавання асноў дэмакратыі і народаўладдзя ў РБ.

**Прынцыпы, на якіх будуецца краязнаўчая праца з вучнямі**:

- сістэмасць;
- адкрытасць;
- даступнасць;
- выхаванне праз сацыяльна значную дзейнасць;
- інтэграцыя намаганняў усіх зацікаўленых асоб.

**Краязнаўчая праца складаецца з наступных напрамкаў.**

**1. Школьны краязнаўчы музей**

***Мэта:*** усведамленне вучнямі маральнай каштоўнасці свайго дачынення да лёсу Радзімы і сваёй малой радзімы, яго мінуламу, сучаснасці і будучыні.

***Задачы:***

1) выхоўваць пачуццё гонару за нашу краіну і яе герояў;

2) спрыяць развіццю ў школьнікаў пачуцця адказнасці за будучыню Беларусі і сваёй малой радзімы.

***Формы працы:*** тэматычныя класныя гадзіны, урокі мужнасці, вусныя часопісы, гутаркі, пошукава-даследчая праца, канферэнцыі, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і людзьмі, якія здзейснілі свае подзвігі ў мірны час, святы, прысвечаныя памятным датам у гісторыі Беларусі і сваёй малой радзімы.

**2. Выхаванне грамадзяніна і патрыёта**

***Мэта:*** фарміраванне грамадзянскай і прававой скіраваннасці асобы, яе актыўнай жыццёвай пазіцыі.

***Задачы:***

1) выхоўваць здольнасць да ўсведамлення сваіх правоў і абавязкаў;
2)выхоўваць здольнасць да ўсведамлення правоў і абавязкаў іншага чалавека;
3) развіваць вучнёўскае самакіраванне;
4) фарміраваць праявы актыўнай грамадзянскай пазіцыі;
5) фармаваць у школьнікаў сістэму ведаў, павагі і цікавасці да дзяржаўных сімвалаў РБ.

***Формы працы:*** тэматычныя класныя гадзіны, калектыўныя творчыя справы, конкурсы, віктарыны па краязнаўчай тэматыцы, сустрэчы з вядомымі і паважанымі людзьмі сваёй малой радзімы і ветэранамі педагагічнай працы, акцыі, дыспуты.

**3. Мая малая радзіма**

***Мэта:*** выхаванне ў вучняў пачуцця павагі да сваёй малой радзімы.

***Задачы:***

1) вывучаць гісторыю роднага краю;

2) выхоўваць у школьнікаў пазіцыю Я – грамадзянін РБ.

***Формы працы:*** краязнаўчая праца, выпуск улётак і газет, віктарыны па гісторыі сваёй малой радзімы, тэматычныя класныя і інфармацыйныя гадзіны, сустрэчы з вядомымі людзьмі сваёй малой радзімы, сустрэчы з ветэранамі педагагічнай працы школы і сваёй малой радзімы, дыспуты, прадметныя тыдні, вусныя часопісы

4**. Я і сям'я**

***Мэта:*** усведамленне вучнямі, што сям'я – галоўная жыццёвая каштоўнасць для кожнага чалавека.

***Задачы:***

1) выхоўваць культуру сямейных зносін, пазітыўных сямейных каштоўнасцей;

2) павялічваць педагагічную і псіхалагічную кампетэнцыю бацькоў;

3) ствараць умовы для ўдзелу бацькоў у выхаваўчым працэсе сваіх дзяцей.

***Формы працы:*** індывідуальныя і групавыя гутаркі з вучнямі і іх бацькамі, бацькоўскія сходы, бацькоўскі лекторый, індывідуальнае кансультаванне, сустрэчы з ветэранамі педагагічнай працы школы і сваёй малой радзімы, розныя сумесныя мерапрыемствы, анкетаванне, сямейныя святы, гадзіны зносін.

Прапануем вашай увазе **пазакласнае мерапрыемства ў 6 класе «Гарады Беларусі»**

***Мэта:*** усведамленне навучэнцамі свайго дачынення да лёсу краіны, яе мінулага, сапраўднага і будучага.

***Ход мерапрыемства***

*Школьнікі працуюць у групах. На сталах перад імі – кнігі, папера, ручкі, малюнкі, паштоўкі.*

***Настаўнік.*** Гарады Беларусі. Яны, як і людзі. У кожнага з іх свой непаўторны твар, свой асаблівы жыццёвы шлях і лёс. Адны з іх славяцца гераічным мінулым, важнай роляй у пэўных гістарычных падзеях. Другія – архітэктурнымі помнікамі мінулых стагоддзяў і прыгажосцю сучасных збудаванняў. Трэція – маладосцю, навуковымі і спартыўнымі дасягненнямі сваіх жыхароў. Разам з тым на жыццёвым шляху гарадоў нашай краіны ёсць і шмат агульнага. Самыя старажытныя гарады на тэрыторыі Беларусі ўзнікалі вакол паселішчаў, дзе жыў князь са сваёй дружынай. Яны знаходзіліся на ўзвышэннях пры зліцці рэк, што было прыдатным як для сувязі з суседнімі княствамі, так і для абароны ад ворагаў. Гарады ўзмацняліся драўлянай агароджай, рвамі і валамі.

Сёння мы будзем гаварыць пра некаторыя гарады нашай краіны.

*Выступленне груп дзяцей: кожны з вучняў прэзентуе інфармацыю аб пэўным горадзе, выступленне суправаджаеца прэзентацыяй.*

***Вучань 1.*** Горад Мінск – галоўны горад нашай Радзімы, гэта яе сталіца. Ён носіць ганаровае званне горад-герой. Мінск – адзін з найпрыгажэйшых гарадоў Еўропы. Яго госці адразу трапляюць на прывакзальную плошчу. Тут размешчаны прыгожы будынак чыгуначнага вакзала. З гэтага месца мы можам лёгка трапіць на плошчу Незалежнасці, Тут размешчаны Дом Ураду нашай краіны(ілюстрацыя). На плошчы Незалежнасці знаходзіцца гістарычны помнік горада – касцёл святых Сымона і Алены. У горадзе шмат культурных устаноў, дзе можна добра адпачыць, паслухаць музыку і паглядзець цікавую кінастужку.

***Вучань 2.*** Горад Барысаў – адзін з самых старажытных гарадоў нашай краіны. Ён знаходзіцца на тэрыторыі Мінскай вобласці. Барысаў быў заснаваны ў 1102 годзе полацкім князем Барысам

***Вучань 3.*** Выгаднае геаграфічнае становішча спрыяла яго хуткаму развіццю. Да сярэдзіны 13 стагоддзя Барысаў становіцца важным гандлёвым цэнтрам. Вельмі пакутваў Барысаў ад шматлікіх войнаў. У 1812 годзе рускае войска знішчыла армію Напалеона пры пераправе праз Бярэзіну. За час гэтай жа вайны горад быў амаль увесь знішчаны. З 1920 года Барысаў хутка развіваецца. У горадзе пачалі працаваць буйная запалкавая фабрыка, фанерны завод, шклозавод, фабрыка па выпуску піяніна. 22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна, якая парушыла мірныя планы жыхароў горада.

***Вучань 4.*** Пачалася гераічная абарона горада. Планы фашыстаў на хуткую перамогу ў вайне былі сарваны.

***Вучань 5.*** Мы раскажам пра невялікі гарадок Гродзенскай вобласці-Іўе. Упершыню Іўе згадваецца ў летапісу ў 1444 годзе. На працягу многіх стагоддзяў у горадзе мірна жывуць і працуюць белрусы і рускія, палякі і яўрэі. Многа выпрабаванняў выпала вытрымаць жыхарам Іўя ў час Вялікай Айчыннай вайны. У 2000 годзе Іўе стала горадам, а ў 2007 годзе быў зацверджаны яго герб і сцяг. Цяпер Іўе – цэнтр Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. Ён знаходзіцца ў 158 км ад абласнога цэнтра і 145 км ад сталіцы нашай краіны.

***Вучань 6.*** Прыгожы і маляўнічы гэты край. Ён багаты дубовымі барамі, светлымі бярозавымі лясамі. У лясах водзіцца шмат звяроў і птушак, а на палянах растуць прыгожыя кветкі. Славіцца горад і працавітасцю сваіх жыхароў

***Настаўнік.*** У кожнага горада быў свой герб і сцяг. Тэрмін *геральдыка* ў перакладзе з лацінскай мовы азначае *гербазнаўства,* г зн. складанне і вывучэнне гербаў. Раскажыце нам пра гербы некаторых беларускіх гарадоў.

***Вучань 1.*** Горад Вілейка быў заснаваны на беразе ракі Вілія. Паглядзіце на герб гэтага горада: на чырвоным полі срэбная рака, па ёй плыве судна з цюкамі тавараў і залатым коласам пасярэдзіне. Гэта азначае, што Вілейка з'яўлялася важным цэнтрам гандлю збожжам. Гэтаму гербу больш 200 гадоў, а гораду – больш 400.

***Вучань 2.*** Горад Быхаў вядомы з 14 стагоддзя. У 1610 годдзе. ў горадзе былі пабудаваны магутныя ўмацаванні. Быхаў не раз быў спалены варожымі войскамі, але праз некаторы час адбудоўваўся і станавіўся яшчэ прыгажэйшым. У цэнтральнай яго частцы знаходзілася крэпасць. Тут быў размешчаны ваенны гарнізон. Думаецца зразумела, чаму ў гэтага горада такі герб: на чырвоным полі дзве перахрышчаныя гарматы.

***Вучань 3.*** Ёсць у нашай краіне горад, назва якога адбілася на яго гербе: на блакітным полі намалявана галава ваўка. Гэта горад Ваўкавыск. Упершыню ён згадваецца як крэпасць на заходняй мяжы старажытнарускай дзяржавы. Аднак Ваўкавыск быў не толькі ваеннай крэпасцю, але і буйным цэнтрам гандлю. Ён славіўся вырабамі кавалёў і ганчароў.

***Вучань 4.*** У Магілёўскай вобласці ёсць горад Горкі, які вядомы з 16 стагоддзя. Размешчаны ён на ўзгорках, пересякаемых калісьці паўнаводнымі рэкамі. Гэта адбілася і на яго назве, і на яго гербе: на залатым полі тры чорныя горкі, з іх вырастае па адным зялёным коласе. Тут знаходзіцца Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія.

***Настаўнік.*** Вучні нам расказалі пра невялікія беларускія гарады і аб іх гербах. Я думаю, што гербы вялікіх нашых гарадоў вы ведаеце. Цяпер мы гэта праверым.

*Да дошкі выходзяць 6 вучняў з намаляванымі гербамі абласных гарадоў. Астатнім школьнікам прапануецца назваць герб кожнага абласнога цэнтра.*

***Настаўнік.*** Кожны горад славіцца не толькі сваёй гісторыяй і зручным геаграфічным становішчам, але і сваімі самымі прыгожымі месцамі. Давайце прадставім такую сітуацыю. Да вас прыехалі госці з іншай краіны. Яны просяць вас расказаць пра вашу Радзіму, пра яе самыя прыгожыя месцы. Што б вы ім расказалі?

***Вучань 1.*** Шмат у Беларусі прыгожых месцаў. Адно з іх – Белавежская пушча. Свой пачатак яна бярэ ад горада Камянца, дзе ўжо больш сямі стагоддзяў стаіць старажытная вежа – Камянецкі слуп. У летапісах захавалася дата яе нараджэння. У 1276 годдзе валынскі князь Уладзімір на ўзвышшы ў ракі Лясная загадаў пачаць будаўніцтва горада: вежа была пабудавана на ўзгорку. Вакол яе вырылі рвы. Іх напоўнілі вадой. Камянецкая вежа – адзін з найстаражытнейшых помнікаў Беларусі. Цяпер у ёй знаходзіцца краязнаўчы музей.

***Вучань 2.*** Горад Навагрудак – адзін з самых старажытных на Беларусі. Самыя вядомыя месцы у горадзе – руіны старажытнага замка і гарадскі парк. Каменны замак у Навагрудку на Замкавай гары – унікальнае збудаванне. У замку налічваецца 7 веж. Дадаткова замак абараняўся ўмацаваннямі і земляным валам, на якім стаялі драўляныя абарончыя збудаванні. У памяць свайго знакамітага земляка паэта Адама Міцкевіча жыхары горада насыпалі Курган Неўміручасці. На камені можна прачытаць словы паэта:

Край дзіцячых гадоў,<br>
З надзеямі і снамі,<br>
Як першае каханне, ,<br>
Ты назаўжды з намі...

***Вучань 3.*** Горад Полацк для жыхароў Беларусі мае асаблівае значэнне. Гэта радзіма беларускага першадрукара Ф. Скарыны, педагога і пісьменніка С. Полацкага, святой Е. Полацкай. Імёны гэтых людзей вядомыя далёка за межамі нашай краіны. Полацк – самы старажытны горад на Беларусі. Ён вядомы з 862 гада. Унікальным помнікам мінулых часоў з'яўляецца Сафійскі сабор. У час нападу на горад у царкве знаходзілі прытулак яго жыхары. У Сафійскім саборы захоўваліся святыні і скарбы горада. Тут праходзілі самыя ўрачыстыя і важныя сходы жыхароў Полацка.

***Настаўнік.*** Вось і закончылася наша падарожжа па гарадах краіны. Што вам сёння запомнілася? (*Адказы вучняў.*) Нам не атрымалася сёння

наведаць многіх гарадоў Беларусі. Таму знаёмства з гістарычным мінулым Беларусі ў нас будзе працягвацца і далей. Дзякуй вам за ўдзел у занятку.

**Літаратура**


1. **Каваль, У. І.** Чым адгукнуцца словы / У. І. Каваль. – Мінск: Народная асвета, 1994. – 48 с.
2. **Лыч, Л. М.** Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 128с.